# Беларусь 23 чэрвеня 2020

## Змяненні ў перамяшчэннях

Гэты набор даных прызначаны для барацьбы з наступствамі COVID-19. Яго нельга выкарыстоўваць у мэтах медыцынскай дыягностыкі, прагназавання і лячэння. Ён таксама не прызначаны для выкарыстання ў якасці рэкамендацый па планах асабістых паездак.

Набор даных кожнай справаздачы пра перамяшчэнне жыхароў разбіты па геаграфічных рэгіёнах і паказвае працэнтныя змяненні ў наведванні людзьмі грамадскіх месцаў (напрыклад, прадуктовых крам і паркаў). Як выкарыстоўваць гэту справаздачу.

Дакладнасць месцазнаходжання і разбіўка па катэгорыях месцаў для розных рэгіёнаў розныя, таму мы не рэкамендуем выкарыстоўваць гэтыя даныя для параўнання краін або рэгіёнаў з рознымі характарыстыкамі (напрыклад, мясцовасцей з сельскім і гарадскім насельніцтвам).

Пра тое, як мы разлічваем гэтыя тэндэнцыі і захоўваем прыватнасць, чытайце ў раздзеле Пра гэтыя даныя.

### Гандаль і адпачынак

**+1 %**

у параўнанні з асноўным значэннем




Дынаміка перамяшчэнняў па такіх месцах, як рэстараны, кафэ, гандлёвыя цэнтры, тэматычныя паркі, музеі, бібліятэкі і кінатэатры.

### Прадуктовыя крамы і аптэкі

**+10 %**

у параўнанні з асноўным значэннем




Дынаміка перамяшчэнняў па такіх месцах, як прадуктовыя і фермерскія рынкі, харчовыя склады, спецыялізаваныя прадуктовыя крамы і аптэкі.

### Паркі

**+59 %**

у параўнанні з асноўным значэннем




Дынаміка перамяшчэнняў па такіх месцах, як нацыянальныя паркі, грамадскія пляжы і скверы, прыстані, месцы для выгульвання сабак і плошчы.

## Прыпынкі грамад. транспарту

# -4 %

у параўнанні з асноўным значэннем




Дынаміка перамяшчэнняў па такіх месцах, як вузлы грамадскага транспарту (напрыклад, станцыі метро, аўтобусныя прыпынкі і чыгуначныя станцыі).

## Месцы працы

# -24 %

у параўнанні з асноўным значэннем




Дынаміка перамяшчэнняў па месцах працы.

## Месцы жыхарства

# +1 %

у параўнанні з асноўным значэннем




Дынаміка перамяшчэнняў па месцах жыхарства.

## Пра гэтыя даныя

Гэтыя справаздачы паказваюць, як змяняюцца наведванне і працягласць знаходжання ў розных месцах у параўнанні з асноўным значэннем. Мы разлічваем гэтыя змяненні на падставе такіх жа згрупаваных ананімізаваных даных, якія выкарыстоўваюцца для паказу загружанасці месцаў у Google Картах.

Штодзённыя змяненні параўноўваюцца з асноўным значэннем для гэтага дня тыдня:

- Асноўнае значэнне з'яўляецца *медыянным* значэннем для адпаведнага дня тыдня ў 5-тыднёвы перыяд з 3 студзеня па 6 лютага 2020 года.

- Справаздачы паказваюць дынаміку на працягу некалькіх тыдняў. Інфармацыя прыходзіць са спазненнем на 2-3 дні: менавіта столькі часу трэба для стварэння справаздач.

Якія даныя будуць уключаны ў падлік, залежыць ад карыстальніцкіх налад, магчымасці падключэння і выканання нашых патрабаванняў да парогавага значэння прыватнасці. Калі парогавае значэнне прыватнасці не дасягнута (месца не настолькі загружанае, каб забяспечыць ананімнасць), мы не паказваем змяненне на працягу дня.

Мы ўключаем катэгорыі, якія адносяцца да захоўвання сацыяльнай дыстанцыі, а таксама доступу да асноўных паслуг.

Гэта аналітыка атрымана на падставе даных карыстальнікаў, якія ўключылі ў сваім Уліковым запісе Google гісторыю месцазнаходжанняў, таму даныя адлюстроўваюць выбарку нашых карыстальнікаў – адпаведна, яны могуць і не апісваць дакладныя паводзіны шырэйшай групы насельніцтва.

Мы працягваем паляпшаць справаздачы па меры таго, як аб'екты зачыняюцца і зноў адчыняюцца. Абнавіўся спосаб разліку змяненняў для катэгорый *Прадуктовыя крамы і аптэкі*, *Рознічны гандаль і адпачынак*, *Прыпынкі грамадскага транспарту* і *Паркі*. У апублікаваных да мая 2020 г. даных па рэгіёнах можа быць стабільны зрух (уверх ці ўніз), пачынаючы з 11–18 красавіка 2020 г.

## Забеспячэнне прыватнасці

Гэтыя справаздачы былі распрацаваны так, каб быць карыснымі, але адначасова і строга адпавядаць прынятым намі правілам абароны прыватнасці карыстальнікаў. Да звестак, па якіх можна ідэнтыфікаваць асобу, такіх як яе месцазнаходжанне, кантакты або перамяшчэнне, доступ ніколі не даецца.

Статыстыка ў такіх справаздачах ствараецца з выкарыстаннем згрупаваных ананімных набораў даных, атрыманых ад карыстальнікаў, якія ўключылі Гісторыю месцазнаходжанняў (пры стандартных наладах гэта налада выключана). Карыстальнікі, якія ўключылі Гісторыю месцазнаходжанняў, у любы час могуць выключыць яе ў сваім Уліковым запісе Google, а таксама выдаліць даныя Гісторыі месцазнаходжанняў са сваёй Храналогіі.

Пры стварэнні справаздач выкарыстоўваюцца тыя ж высакакласныя тэхналогіі ананімізацыі, якія прымяняюцца штодня ў прадуктах Google і забяспечваюць прыватнасць і бяспеку вашых даных. У справаздачах прымяняецца дыферэнцыяльная прыватнасць – пры яе выкарыстанні ў нашы наборы даных дадаюцца штучныя шумы, якія не даюць ідэнтыфікаваць канкрэтных асоб, але дазваляюць атрымаць высакаякасныя вынікі аналізу. Гэтыя меры па ахове прыватнасці таксама не дазваляюць атрымаць абсалютную колькасць наведванняў.

## Іншыя рэсурсы

Як можна выкарыстоўваць гэту справаздачу ў рабоце, вы можаце даведацца, перайшоўшы па спасылцы Даведка па справаздачах пра перамяшчэнне жыхароў.

Атрымаць актуальную справаздачу можна на старонцы google.com/covid19/mobility